Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ НІВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

№. 22 (35). Вільня, Аўторак, 16-га сакавіка 1926 г. Год II.

Да ўсіх нашых падпішчыкаў і прыяцеляў.

Грамадзяне!

Неаднакроць да нас прыходзілі вашыя скаргі на тое, што наша газэта **дорага каштуе**, што яна вам не па сілам у цяперашнія часы агульнае руіны і галіты.

Скаргі — зусім слушныя. Але-ж справа ў тым, што **парадзіць бядзе можаце якраз толькі вы самі**, нашы падпішчыкі, чытачы і прыяцелі.

Думае мо' хто з вас, што выдаўцы газэты маюць нейкую матэрыяльную карысьць, нейкі даход з яе?! Ды нічога падобнага! Калі-б не дапамога нашага грамадзянства і спагадаючых нам пасло́ў, газэта—пры сучаснай лічбе яе падпішчыкаў—жыць не магла-бы.

Вось і хочам тут усім нашым спагадчыкам, усім, што жывуць аднэй з намі думкай і адным супольным імкненьнем, растлумачыць палажэньне газэты і той шлях, які можа даць нам магчымасьць **зьменшыць падпісную цану**, ці за старую цану выпускаць „Беларускую Ніву" часьцей.

Галоўныя выдаткі газэты — гэта набор (складаньне) ў друкарні, адбіваньне на машыне, рассылка поштай, утрыманьне працаўнікоў адміністрацыі і рэдакцыі, якія, каб працаваць, мусяць-жа мець з чаго жыць. Вось-жа такія выдаткі, як складаньне газэты і ўтрыманьне рэдакцыі і адміністрацыі, пры друку газэты ў тым ліку, як ёсьць цяпер, **абходзяцца зусім гэтульні-ж, як і пры друку ў пяцёх, шасьцёх, ці дзесяцёх тысячах**, а за **надрукаваньне** кожнае **новае тысячы** экзэмпляраў да ўсіх гэтых асноўных выдаткаў дадаецца **адно толькі кошт адбіваньня на машыне, паперы і аплаты пошты.** Гэтак выпуск кожнае новае **тысячы** экзэмпляраў газэты каштуе агулам шмат **менш**, чым дае падпіска за яе.

З гэтага простага рахунку ясна кожнаму, **што** на новых дзьвюх-трох **тысячах** мы мелі-бы даход, які і даў-бы нам магчымасьць ці то **панізіць цану падпіскі, ці за старую цану выпускаць газэту часьцей.**

Грамадзяне! **Ад вас залежыць зьдзейсьніць гэта, вы—і толькі вы!**—можаце нам памагчы зрабіць наш орган больш даступным кожнаму па цане! Трэба толькі, **каб кожны з вас прыдбаў нам аднаго-двух падпішчыкаў**!

І мы звараемся да вас з гарачым заклікам: памажэце нам і **сабе самым** у гэтым!

Трэба павясьці **шыбкую і дружную агітацыю** па нашых вёсках і мястэчках, **каб усюды выпісвалі „Беларускую Ніву"**. І рабіць гэта трэба не адкладаючы—зараз, каб **да 25 сакавіка** мы маглі-бы зрабіць падрахунак новых падпішчыкаў і **ад 1 красавіка** распачаць высылку газэты **на новых варунках.**

Грамадзяне! Зразумейце, што газэта—гэта-ж **уласнасьць тых, хто яе выпісвае і чытае**! Яна—ваш таварыш і дарадца ў жыцьці, яна дапамагае вам прасьвятлеўшымі вачыма глядзець на сьвет і знайсьці ў ім **свой шлях і сваё месца.**

Дык-жа ўсе—да дзела! Памысны вынік нашага праекту залежыць ад таго, каб астаўшыяся да 25 сакавіка два тыдні кожын выкарыстаў дзеля **агітацыі на карысьць сваей газэты,** каб кожын прыдбаў нам хоць двух ці навет аднаго новага падпішчыка!

ЧАРОДНАЯ КАНФІСКАЦЫЯ. Камісар Ураду на м. Вільню сканфіскаваў № 21 „Беларускае Нівы" з 13-га сакавіка за зьмяшчэньне гэткіх стацей і заметак: перадавіцы п. з. „Пагрозы коаліцыйнаму ўраду", „Забарона вулічнага збору на карысьць беларускага прытулку" і нешта 8 ці 9 карэспандэнцыяў з вёсак... Апошняе—асабліва знаменна!

Банкруцтва Лігі Народаў.

Вельмі магчыма, што ў той мамэнт, калі гэты нумар дойдзе да рук нашых чытачоў, востры крызіс, перажываны Лігай Народаў, ужо закончыцца.

Але, які-б ні быў канец гэтага крызісу, адно наперад можна сказаць: *ідэя Лігі Народаў у сучасным яе стане—збанкрутавала.*

Запраўды-ж: ужо пры самых закладзінах Лігі было ясна, што гучны назоў яе: Ліга *Народаў* — гэта-ж адно ашуканства! Яна ня была, ня ёсьць і ня будзе запраўдным Саюзам Народаў: гэта — „акцыянернае таварыства" *не народаў, а дзяржаў*,—інакш кажучы: *саюз дзяржаўных народаў*, якія згуртаваліся, каб з агульнай згоды зацісьнуць пятлю на шыі народаў *недзяржаўных*, пазбаўленых імі і волі і навет голасу...

Мала таго: *павадырства* ў Лізе ўзялі ў свае рукі *найвялікшыя* спаміж дзяржаваў-пераможцаў у сусьветнай вайне (без Амэрыкі і СССР), якія далі самі сабе права заняць сталыя мейсцы ў Радзе Лігі, допускаючы туды-ж толькі часова меншыя дзяржавы, прымушаныя лічыцца з воляй кіруючых сусьветнай палітыкай гаспадарстваў. І ўжо ў гэтым выявілася ўся *крывадушнасьць* таго прынцыпу, на якім пабудавана Ліга: перад ёю *няроўнымі* зьяўляюцца ня толькі *народы* (дзяржаўныя і недзяржаўныя), але й *дзяржавы*. Каторая дужэйша, тая й мае больш павагі, тая і *бярэ* сабе права камандаваць слабейшымі...

Было гэта й *бяз Лігі*.

Дык-жа вось на нашых вачох на Лізе цяжка памсьцілася тая *крыўда адносна да слабейшых*, якую дужэйшыя аб'явілі сваім „сьвятым", правам. Ні больш, ні менш, толькі—*слабейшыя збунтаваліся*!

Сьпярша Англія і Францыя згаварыліся пусьціць у склад Рады Лігі — Нямеччыну. І слушна: раз Рада — гэта арганізацыя найдужэйшых, дык каму-ж і ўвайсьці ў яе, калі не Нямеччыне, якая паказала сваю сілу, змагаючыся ў працягу некалькіх гадоў з аб'яднанымі найвялікшымі дзяржавамі старога і новага сьвету?! Але вось іменна тады проці сваіх дужэйшых павадыроў і паўсталі слабейшыя сябры Лігі: і Польшча, і Гішпанія, і Бразылія і інш. „*Пусьцеце й нас у Раду*!"

Хацелі Чэмбэрлены і Брыяны іх здаволіць,—ды Нямеччына ня хоча! Ня хочуць і другія спасярод малых дзяржаў, ня прымаўшых учасьця ў вайне,—з Швэцыяй на чале. І выхаду ня відаць: або трэба зрачыся свайго правадырства й даць голас „дробязі", — але тады ня пойдуць у Лігу немцы; або — споўніць дамаганьне Нямеччыны і... ўтраціць уплывы на гэную „дробязь".

І так, і сяк—прынцып, на якім збудавана Ліга, ня вытрымаў агнявое пробы жыцьця. Замацаваны Лігай *падзел народаў сьвету на бясправўных* (недзяржаўных), *полуправўных* (меншыя дзяржавы) *і поўнаправўных* (вялікія дзяржавы), як бачым, утрымацца ня можа.

І гэта—галоўная прычына крызісу Лігі, якая і суліць ей—*поўнае банкруцтва*... незалежна ад таго ці *гэты* крызіс Ліга перажывае.

Агульны Збор Лігі Народаў.

8 сакавіка адчыніліся паседжаньні Агульнага Збору Лігі Народаў. 36 галасамі з агульнай лічбы 48 выбраны Старшынёй Збору партугальскі прэм'ер да-Коста. І на гэтым, здаецца, пакульшто і скончыліся ўсе афіцыяльныя працы Лігі.. Здаецца, не адбылося навет, як было прадугледжана, і паседжаньня Рады Лігі, а замест яго нейкая „тайная нарада" яе галоўных сяброў, паведаміўшых толькі адзін аднаго аб **няўдалых перагаворах з нямецкай дэлегацыяй.**

Нямецкая дэлегацыя рашуча і староўча стаіць на сваім, заяўляючы, што дапушчэньне адначасна з Нямеччынай уваходу якой-сь іншай дзяржавы ў Раду змусіць нямецкі ўрад устрымацца ад уваходу Нямеччыны ў склад Лігі наагул.

Перагаворы йшлі бяз учасьця Брыяна, які толькі ў сераду ўвечары, ужо ізноў як прэм'ер і міністар замежных спраў новага ўраду, выехаў з Парыжу ў Жэнэву.

Як сьцьвярджаюць амаль ня ўсе карэспандэнты з Жэнэвы, усе высокія дэлегаты заняліся ўзаемным—**шантажам**!—Нямецкія газэты пішуць, што саюзьнікі шантажуюць немцаў, змушаючы да ўступак—пад пагрозай... зьвярнуцца да самага вялікага прыяцеля іх — марш. Фоша, каб той сьцьвярдзіў, ці Нямеччына споўніла ўсе варункі разбраеньня, каб увайсьці ў Лігу...—„Але-ж Нямеччына—ня Аўстрыя і не Баўгарыя!— адказывае прэса..—Дый часы цяпер—ня тыя"...

Нямецкія дэлегаты на націск Чэмбэрлена адказалі, што вымаганая ад іх уступка выклікала-б ня толькі крызіс ураду, але і крызіс прэзыдэнцкі: паляцеў-бы сам Гіндэнбург. А што было-б далей,—няведама—дадаюць яны.

Але такі самы „малы шантаж", як пішуць іншыя газэты, робяць і іншыя.. Прэм. Скшыньскі націскае на Чэмбэрлена, каб той прыхіліўся да дамаганьняў Польшчы. Той адказывае, што ня можа ісьці проці аднагалоснай апініі Брытанскай Імпэрыі, інакай яго ўрад паляціць уверх нагамі. На гэта п. Скшыньскі адказывае (ў размове з журналістамі, паўтараючы, відаць, тое, што, казаў асабіста Чэмбэрлену), што ён зусім ня зьбіраецца—ў выпадку паражэньня Польшчы ў Лізе—праклямаваць выхад Польшчы з Лігі і збліжэньне яе да СССР... Гэта—няпраўда: ён, Скшыньскі, і яго, Скшыньскага, урад гэтага ня зробіць. Але пэўна і тое, што ён, Скшыньскі, з усім сваім урадам, прыехаўшы ў Варшаву з Жэнэвы з пустымі рукамі, паляціць далоў... А на яго мейсца могуць прыйсьці больш левыя группы... А што ўжо новая коаліцыя зробіць, аб гэтым ён, Скшыньскі, ня ведае, а можа толькі са страхам дагадвацца...

Вось табе, пане Чэмбэрлене: ёсьць і ў Польшчы публічная апінія, як і ў Англіі...

Але і польская прэса піша аб шантажу — пэўна-ж перад усім нямецкім.

„Gaz. Por. Warsz." кажа: „Нямецкі шантаж, шантаж такі цынічны, раскелзаны, якога яшчэ ня бачыў сьвет". Але ў далейшым аказываецца, што „шантажуюць" за і замест немцаў — бэльгійскі прэм. Вандэрвэльдэ, як галава ўсяго II Інтэрнацыяналу, бо ўвесь міжнародавы сацыялізм выразна стануў на бок Нямеччыны. „Шантажуе" на карысьць Нямеччыны і Швэцыя ў асобе свайго новага прэм'ера Ундэна.

Цікавая, мімаходам зробленая рэвэляцыя эндэцкага афіцыёзу, што былы бэльгійскі прэм'ер Юманс зьляцеў за тое, што быў... прыхільнікам Польшчы і хацеў пусьціць яе ў Раду...

„Шантажуе" ўрэшце на карысьць тэй-жа Нямеччыны і афіцыёз самай Лігі Народаў—французская газэта „Журналь дэ Жэнэв", у якім ведамы публіцыст Мартэн піша, што „ўваход Польшчы ў Раду Лігі зусім не павінен цікавіць Францыю: бо гэта-ж — дробная справа ў агульным жыцьці Эўропы"...

Дык пакуль-што — за тры дні сваіх размоў і нарад за кулісамі Лігі—найвыдатнейшыя і адказныя дыпляматы буржуазнай Эўропы займаюцца толькі—узаемным „шантажам"... А бедная Ліга—трашчыць па ўсім швам, пагражаючы кампletным развалам...

Рашучае становішча Нямеччыны.

Пасьля амаль ня цэлага тыдня размоваў і нарадаў Чэмбэрлен і Брыян рабром паставілі нямецкім дэлегатам пытаньне: ці згаджаюцца яны на якісь кампраміс, на падставе якога адначасна з уваходам Нямеччыны ў Лігу і Раду Лігі на тэй жа сэсіі было-б запэўнена сталае ці нясталае мейсца і тэй ці іншай другой дзяржаве (або некальнім?). Маючы на ўвазе, што справа тут ідзе аб Польшчу, Нямецкая дэлегацыя рашуча і аканчальна адказала:—„**Не**".

Як тлумачыў Лютэр у сваім экспозэ журналістам, нямецкая дэлегацыя пэўна-ж ня можа і не жадае адмаўляць Лізе права вырашаць пытаньне аб пашырэньні складу Рады. Нямеччына толькі хоча сама прыняць чыннае і рашучае ўчасьце ў гэтай адказнай працы па рэарганізацыі Рады Лігі, увайшоўшы ў склад Лігі. Дзеля таго яна прапануе, каб, пасьля яе ўваходу ў Лігу і Раду Лігі, была створана камісія, якая б занялася справай рэарганізацыі, як гэта і прадбачыў якраз у сваей апошняй прамове сам п. Чэмбэрлен. Аканчальна-ж тая справа павінна быць вырашана на звычайным Агульным Зборы—у верасьні сёлетняга году. Усялякія іншыя прапазіцыі і кампрамісы немцы адкідаюць.

Адмова немцаў выклікала, як пішуць газэты, „прыгнятаючае ўражаньне ў Лізе".

Брыян у гутарцы з журналістамі пагразіў, што ў такім разе Нямеччына ня можа быць прынята ў склад Лігі... Але-ж Нямеччына на іншых варунках сама ня хоча ісьці ў Лігу!

Чэмбэрлен заявіў журналістам, што ў сувязі з утварыўшымся палажэньнем „лопнуў увесь Лёкарнскі Трактат"! Эўропа ізноў падзелена на два варожыя абозы, і няма ўжо надзеі, каб спор між імі мог быць разьвязаны мірным шляхам... Адказнасьць за ўсё гэтае спадае на... Нямеччыну"...

Вось гэты вывад дык з боку Чэмбэрлена трохі неспадзяваны, — бо-ж нямецкая дэлегацыя стаіць якраз на становішчы самога Чэмбэрлена, высказаным ў яго апошняй перад сэсіяй прамове.

Абвестка.

У чацьвер, 18 гэтага сакавіка, 1926 году адбудзецца Агульны Сход Сяброў Глыбоцкага аддзелу Беларуск. Каапэратыўнага Банку ў Вільні.

Сход адбудзецца ў 10 гадз. раніцы ў памяшчэньні аддзелу Банку ў м. Глыбокім па Віленскай вул. № 37.

УПРАВА.

Сойм.

Узнаўленьне паседжаньняў Сойму.

Назначанае на аўторак паседжаньне Сойму будзе, відаць, адложана. Бо ў гэты дзень, як тлумача „Kur. Warszawski", у Вільні маюць адбыцца... хаўтуры арцыбіскупа Цепляка, на якія едзе большасьць міністраў дый сам п. Прэзыдэнт Рэспублікі. Дык Сойм можа і пачакаць.

Спадзяваліся на гэты-ж дзень і павароту прэм. Скшыньскага ў Варшаву, але гэта — зусім няпэўна, бо да аўторка справы ў Лізе мусіць ня вырашацца.

Інцыдэнт у бюджэтнай камісіі.

Вельмі цікавая гутарка паднялася на апошнім паседжаньні бюджэтнай камісіі Сойму—у часе дыскусіі над бюджэтам мін. унутраных спраў.

Пас. **Выжыковскі** (вызваленец) запрапанаваў скасаваць дыспазыцыйны фонд мін. унутр. спраў. Гэта вялізарная сума—цэлыя 3 мільёны злотых, якой міністар распараджаецца—без усялякай адказнасьці і справаздачы. Якраз з гэтага фонду ідуць грошы перад усім на ўсялякія віды і гатункі „дабравольнага" палітычнага сыску, на акцыю ўсялякіх Паўлюкевічаў і Оскілак. З гэтага-ж фонду была пакрыта калісьці, здаецца, і растрата Аляксюком 600 тысячаў марак вайсковых грошаў і г. д.

Хаця галасаваньнем гэтая прапазіцыя была адкінута, але за яе падалі галасы — апрача Вызваленьня і сялянскай апазіцыі разам з клюбамі меншасьцяў — таксама і ППС і НПР, ці—абедзьве работніцкія партыі, якія ўваходзяць у склад урадавай коаліцыі. Гэткім чынам гэтыя дзьве ўрадавыя партыі выразілі тым самым яўнае недаверые асабіста міністру, які мае дыспанаваць гэтым фондам: п. Рачкевічу.

Бліжэйшым вынікам гэтага галасаваньня можа аказацца адстаўка п. Рачкевіча.

Нарады „Вызваленьня" і „Еднасьці Людовай".

На 20-га і 21-га сакавіка назначаны нарады клюбаў „Вызваленьня" і „Еднасьці Людовай", на якіх маюць быць падрыхтаваны рэзалюцыі для партыйнага зьезду.

Як паведамляе прэса, гэтыя групы маюць дамагацца пашырэньня паўнамоцтваў прэзыдэнта Рэспублікі, а іменна: наданьня яму права роспуску Сойму, а таксама—зьмены Канстытуцыі (?!).

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Усходня-эўрапэйскае „Лёкарно".

Саюзная ваенная ўмова між Польшчай і Румыніяй утраціла ўжо сваю сілу. З прычыны хваробы румынскага прэм. Братыяну прэм. Скшыньскі пастанавіў адцягнуць крыху перагаворы аб узнаўленьні саюзу. Але п. Скшыньскі мае пляны і амбіцыі значна шырэйшыя: ён хоча выступіць „чэмбэрленам" між ССРР і Румыніяй і запрапанаваць абедзьвюм дзяржавам стварыць

„Ад імя Беларускага Народу".

Як ведама, здаецца йшчэ ў 1920 годзе пан Вацлаў Ластоўскі, эсэраўскі „прэм'ер", „падараваў" Вільню разам з усей Віленшчынай і Горадзеншчынай — **Літве**. За падпісаньне акту аб гэтай перадачы Беларускае зямлі чужым—ад імя Беларускага Народу!—літоўскі ўрад абязаўся выплаціць „ураду" пана Ластоўскага адзін мільён нямецкіх марак...

Надовячы абшарніцкае „Słowo" надрукавала заяву „доктара" Паўлюкевіча, які—ізноў-жа ад імя Беларускага Народу! — падараваў Вільню і ўсю Віленскую зямлю — **Польшчы**... У якой цыфры выразілася шчодрасьць польскага ўраду, мы ня ведаем.

Ведам затое адно: калі ўжо да таго дайшло, што права на валаданьне Вільняй і Літва і Польшча грунтуюць на падобных заявах — усё ад імя Беларускага Народу! — самазваных прадстаўнікоў нашага народу тыпу Ластоўскіх і Паўлюкевічаў,—ну, дык, відаць, права гэнае дужа няпэўнае!...

„паўдзённа-усходняе Лёкарно" — ці гаранцыйны пакт, забясьпечваючы сучасныя супольныя граніцы Польшчы, Румыніі і... ССРР!..

Дзіва, што для Польшчы і Румыніі гэтая думка вельмі вясёлая... Але ці таксама — і для ССРР, гэта ўжо—пытаньне.

Чыгункавая ўмова з ССРР.

Дэлегацыя з Менску дзеля ўзнаўленьня камунікацыі між ССРР і Польшай — ізноў прыяжджала ў Вільню, дзе быў аканчальна падпісаны дагавор аб узнаўленьні руху па 2 лініях: з Вільні да Ленінграду праз Загацьце і з Вільні-ж у Гомель—праз Мікашэвічы—Жыткавічы на Палесьсі.

Як ведама, справа ўзнаўленьня руху па лініі Вільня-Радашкавічы-Менск была вырашана нядаўна на папярэдняй такой-жа канфэрэнцыі ў Вільні.

Арышт рэдактара газэты „За Вольнасьць".

Рэдактар радыкальнай газэты ня то пілсудчыкаў, ня то—йшчэ лявейшай,—„За Вольнасьць", п. Венява-Длугошэвскі, за артыкулы, падбураючыя да бунту і абражаючыя ўладу, пацягнуты да адказнасьці. Сьледчы зажадаў арыштаваньня рэдактара, або залогу 5.000 злотых. Залогу ня ўнесьлі, дык рэдактар (здаецца, брат б. ад'ютанта марш. Пілсудскага!) пасаджаны ў вастрог.

Мар'явіцкі біскуп пад судом за— „блюзьнерства".

У Плоцкім Акружным Судзе разглядалася справа ведамага мар'явіцкага біскупа Кавальскага, абвінавачанага ў „блюзьнерстве процi Бога ў друку". Біскуп засуджаны на 1 год крэпасьці. Пад залог у 500 злотых біскуп звольнены спад арышту.

Заграніцай.

Новы ўрад старога Брыяна.

Уначы на 11-га сакавіка Брыяну ўдалося зложыць новы габінэт—з 10 паслоў і 3 сэнатараў, у які

Польшча і Усход.

(*Лекцыя Т. Голувкі ў Вільні*).

У нядзелю, 7-га сакавіка публіцыст і супрацоўнік Пэпэсаўскага „Работніка" Голувко прачытаў у Вільні публічную лекцыю на тэму: „Польшча і Ўсход".

Пачаўшы ад таго, што ўсе палякі зацікаўлены ў апошнія дні вырашэньнем пытаньня, ці Польшч дастане мейсца ў Радзе Лігі Народу, лектар выясьніў, што гэная зацікаўленасьць выклікана **страхам** перад будачынай польскае палітыкі.

Страх гэны, паводле думкі прамоўцы, зьяўляецца вынікам таго кірунку міжнародавае палітыкі, якую вяла Польшча ад пачатку свайго паўстаньня.

Апіралася гэная палітыка на мілітарных саюзах з Францыяй і Румыніяй. Першы быў аховай Польшчы ад Немцаў, якія, паводле кіраўнікоў польскае палітыкі, заўсягды мелі быць ворагамі Францыі; другі—процi вялікага Усходняга Суседа С. С. Р. Р.

Але вось уклад сілаў у міжнародавым жыцьці высунуў на чало Англію, якая давяла да трактатаў у Лёкарно, скіраваных процiў С.С.Р.Р. і беспасрэдна забясьпечываючых усходнія граніцы Францыі, якая гэткім чынам знаходзіць супольны шлях у міжнародавым жыцьці з Нямеччынай. Англія-ж, ізноў паводле трактату ў Лёкарно, з саюзьніцы Францыі становіцца толькі судзьдзёй, абаронцам гэных самых трактатаў, якія зьмяншаюць шансы на помач з боку Францыі для Польшчы ў канфлікце апошняй з Нямеччынай.

Дый значэньне Францыі, перажываючай фінансавы крызіс, паменшала, і яна,—кажа прамоўца—пачынае траціць тое палажэньне, якое дагэтуль займала. Як і другія раманскія дзяржавы—Гішпанія, Партугалія,—Францыя ўжо ізжылася і зыходзіць на другі плян у міжнародавай палітыцы. Кіраўніцтва-ж гэнай палітыкай належа цяпер да дзяржаў народаў германскіх і англасаскіх—Англіі, Нямеччыны, Амэрыкі.

Другі саюзьнік Польшчы—Румынія знаходзіцца ў такім стане ўнутранага раскладу, што не прадстаўляе ніякае сілы — Румынія — гэта адзін страх перад усходнім суседам яе, гэта—край усялякіх магчымасьцяў і непакою.

І Польшча аказалася без саюзьнікаў, на якіх магла-б спадзявацца ў цяжкія для яе часіны.

Самае-ж географічнае палажэньне Польшчы вельмі цяжкое. Ад Захаду і Усходу стаяць дзьве сьцяны, моцныя і грозныя, якія могуць зрушыцца з мейсца і яшчэ шчыльней сьціснуць Польскую Дзяржаву,

Адна—гэта нямецкая жалезна-бэтонная сьцяна з Захаду, што ўжо замазала шчыліны, зробленыя сусьветнай вайной, ды якую ня здолела скрануць з мейсца і разварушыць хітрэцкая французская палітыка, даўшая ўрэшце супакой гэнай рабоце.

Вялікі, культурны, арганізаваны 70-міліённы нямецкі Народ ня сёньня-заўтра злучыцца з Аўстрыяй.

У гэную сьцяну біць нельга, бо кулаком будзе дрэнна.

Другая сьцяна—гэта вялікі абшырны арганізм бальшавіцкае Расеі, якая, паміма арыентацыі польскіх Грабскіх на нейкую „трэцьцюю" Расею, жыве, арганзуецца і ўмацовываецца.

Пасьля Лёкарно нельга спадзявацца, каб французскія жаўнеры баранілі Польшчу ад Нямеччыны, а—кажа прамоўца—дзеля гэтага трэба шукаць супольных слоў з Усходнім суседам, згодна з ім жыць, бо залішне грозная і сільная гэтая жалезна-бэтонная сьцяна.

Польская палітычная думка **павінна** шукаць сваe прышласьці **на Усходзе**.

Перад усім трэба скончыць з станам „ні вайна ні мір" з Літвой; толькі была-б добрая воля польскіх палітыкаў, а гэны стан, нячуваны ў гісторыі, можна зьмяніць на згоднае сужыцьце з Літвою.

Далей, палітычны розум вымагае для Польшчы наладжаньня як найлепшых адносін з балтыцкімі рэспублікамі—Эстоніяй і Латвіяй, чаго дагэтуль палякі не рабілі, уважаючы, што іх гонар, як „вялікага моцарства", на гэта не пазваляе.

Палітыка ня робіцца з дня ды на дзень—vom Fall zu Fall, як кажуць немцы. Трэба думкай сягаць далей—і паводле гэнага пляну наладжываць сваю палітыку,—кажа прэлегент.

Якой-жа яна мае быць?

Грамадзянін Голувко відзіць ратунак Польшчы і выхад з таго стану страху, у якім яна дагэтуль знаходзіцца,—**ў фэдэрацыі з Незалежнай Беларусяй і Украінай.**

Там, за сьцяной усходняй, ідзе вялікі працэс: валюнтарыстычна, сьвядома крысталізуецца Незалежнае Дзяржаўнае жыцьцё Беларусі і Украіны. Гэнага працэсу ніхто ўжо спыніць ня здолее, і **там яго ня спыняюць.**

Хаця, — кажа прамоўца — палітычны ўклад жыцьця ў Савецкай Беларусі і Украіне залежыць у значнай меры ад Масквы, затое ў галінах прасьветы, эканамічнага і гаспадарчага жыцьця **і Беларусь і Украіна што-раз больш выходзяць на самастойную дарогу.**

Ужо цяпер **ўсе школы выховываюць дзяцей у матчынай мове**, і ня толькі пачаткавыя, але н'ат сярэднія. Істнуюць 2 ўкраінскія ўнівэрсытэты ў Харкаве і Кіеве, гэтак сама беларусізуецца ўнівэрсытэт у Менску. Гэтак там, за ўсходняй сьцяной, расьце новае пакаленьне, выхаванае ў роднай мове і культуры.

Адміністрацыя гэтак сама пераведзена на зразумелую для народу і родную мову.

І вось, калі будучына Польшчы толькі ў такім ці іншым зьвязку з Незалежнай Беларусяй і Украінай, калі палітычная думка на далейшую мэту павінна шукаць выхаду на Усходзе і бараніцца ўсходняй грознай сьцяны, дык трэба ўвясьці іншыя адносіны да дзесяцімільённае масы меншасьцяў у Польшчы, перад усім да Украінцаў і Беларусаў, якія—як кажа гр. Голувко — здабудуць **волю.**

Але, — заяўляе ён — лятуценьні аб вялікім дзяржаўным арганізьме Польска-Беларуска-Украінскім прадстаўляюцца нейкай донкішатэрыяй, калі паглядзець, як вось цяпер польская палітычная думка адносіцца да гэных лятуценьняў і да тае часткі прышлых грамадзян Беларусі і Украіны, якія воляй лёсу апынуліся ў граніцах Польшчы.

На абшарах Украіны няма ніводнае ўкраінскае школы; у двуязычных школах выкладаецца ўкраінская мова толькі 2 гадзіны ў тыдзень...

Былыя эсэры у новай ролі.

Як мы даведаліся з зусім пэўнае крыніцы, апошні з недабіткаў істнаваўшае некалі партыі Беларускіх Сацыялістаў Рэвалюцыянэраў, **Тамаш Грыб** (студэнт пражскага ўнівэрсытэту), паступіў у лік супрацоўнікаў **дэфэнзыўнае арганізацыі** „доктара" Павлюкевіча. Сваё супрацоўніцтва на новым становішчы ён распачаў з таго, што надрукаваў у польскім дэфэнзыўным органе ў беларускай мове („Беларускае Слово") агідны і брудны пасквіль на беларускага дзеяча Антона Луцкевіча, перасьледаванага польскаю ўладаю.

Трэба думаць, што за першай услугай дэфэнзыве пойдуць і другія падобныя. Відаць, былы эсэр гэтак хоча **купіць сабе права на паварот з Прагі на Бацькаўшчыну—пад Польшчу.**

Перасьцерагаем аб гэтым нашу моладзь у Празе, якая паехала туды з Заходняе Беларусі і маніцца варочацца сюды,—каб ведала, з кім мае дзела...

Характэрна, што адзіны супрацоўнік Грыба ў Празе, **Язэп Мамонька**, які некалі судзіўся ў Менску за звычайны бандыцкі напад,—скандальна скампраматаваўся сувязяй з нямецкімі манархістамі, як аб тым надрукавана ў кнізе Е. Ладнова „Огнемъ и мечомъ, голодомъ и болъзнями", выданай за грошы... польскага генэральнага штабу! Ад немцаў Мамонька хацеў выманіць грошы на... барацьбу з палякамі, пагражаючы, што інакш „паверне аглоблі ў другі бок"...

Ну, вось і павярнуў!..

ўваходзяць амаль ня ўсе выдатнейшыя радыкалы, радыкал-сацыялісты і сацыялісты-рэспубліканцы. Сацыялісты ізноў не ўвайшлі ў габінэт.

Мусоліні пагражае азброеным кулаком.

Італьянскі сэнат прыняў амаль-што бяз дыскусіі вайсковы Статут. Прамаўляў за праектам сам Мусоліні, які, паміж іншым у канцы сказаў: „Часы цяпер няпэўныя,—дык мы павінны быць азброенымі і гатовымі ў кожны мамэнт".

Генарал Кадорна, герой Вялікай вайны, у сваей прамове пазваўся на словы Фрыдрыха Вялікага (Прускага): „замежная палітыка бяз арміі, гэта-ж — канцэрт без аркестру".

Канфлікт між Турцыяй і Англіяй трывае.

Турэцкі ўрад рашуча адмовіўся ад учасьця — на запросіны Лігі Народаў — у перагаворах у справе англійскага мандату ў Іраку (былая правінцыя Турцыі, якую папросту захапіла гвалтам Англія).

Манархічныя пагрозы Нямеччыны.

Калі прэм. Скшыньскі пагражае ў Лізе паляненьнем" Польшчы аж да „збліжэньня з Радамі", дык нямецкая дэлегацыя, наадварот, — таёмна намякае на магчымасьць перамогі ў краі нацыяналістычнага напрамку, які можа зусім неспадзевана ўваскрасіць у Нямеччыне манархію.

Вельмі спрытна якраз на час спорkаў у Лізе Народаў нямецкі ўрад пастанавіў на чаргу дня ў Рэйхстагу (парляманьце) разгляд законапраекту аб паўнамоцтвах прэзыдэнта, што дало добрую нагоду для вялікай манархічнай маніфэстацыі ў парляманьце Рэспублікі... Пасьля прамовы міністра ўнутраных спраў, сьцвярдзіўшага няздольнасьць і праступнасьць дынастыі Гогэнцолернаў (з якой паходзіў Вільгэльм II), павадыр страшэнна абураных нацыяналістаў гр. Вэстарп запрапанаваў выразіць недаверые да міністра—„тымчасовай Нямецкай рэспублікі".

Зьезд расейскіх манархістаў.

У Мюнхене (Баварыя) адбыўся зьезд расейскіх манархістаў усялякіх сартоў. Зьезд мае быццам падрыхтаваць „міжнародавую канфэрэнцыю" манархістаў—расейскіх, нямецкіх і вэнгерскіх. Не хапала-б толькі—польскіх.

Наступленьне Абд-Эль-Крыма.

З Парыжа пішуць, што гішпанскае наступленьне ў Марокко зусім не ўдалося. Рад быццам-то ўжо пакарыўшыхся плямён ізноў узяўся за аружжа. Гішпанскія войскі нясуць вялікія страты людзьмі. Рыфэнам удалося прарвэць гішпанскі фронт у некалькіх мейсцах і амаль не акружыць важнае места Тэтуан.

Узнаўленьне баёў у Сірыі.

Парыжскія газэты паведамляюць, што навакол м. Дыяза ідуць крывавыя баі, у якіх забіты 165 і ранены 103 паўстанцы. А французаў?...

Горача ў вялікім месьце Дамаску, бо консулы заграгічных дзяржаў раюць сваім землякам — пакінуць места...

Сарваньне перагавораў між Радамі і Чангам.

Радавая прэса паведамляе, што з прычыны непрымірымага становішча генарала Чанг-Тсо-Ліна перагаворы між радавай дэлегацыяй і яго паўнамоцнікамі аб паразуменьні і размежаваньні ўплываў на Далёкім Усходзе—сарваны. Гэты зрыў перагавораў, можа, як сьцьвярджае радавая прэса, выклікаць вельмі паважныя скуткі.

Ваеннае ўмяшацельства дзяржаў у кітайскія справы.

Эўрапэйскія дзяржавы-жываеды, занепакоеныя пасьпехамі аднэй Японіі ў Кітаі (пабеды Чанг-Тсо Ліна, гэта-ж замаскаваная інтэрвэнцыя, ці папросту—заваяваньне Кітаю Японіяй!), пастанавілі, што час ужо ўсім ім разам зрабіць супольную ваенную інтэрвэнцыю ў кітайскую хатнюю вайну. Спазьніліся яны, як аткрыта пішуць лёндanскія ўрадавыя газэты, толькі дзеля таго, што да апошняга часу ўпіралася проці ўмяшацельства Амэрыка.

Украінскіх дзяцей вучаць пяяць песьні, але адно толькі польскія...

Войты ня з выбараў, а вызначаныя старастамі... і т. д. і т. д.

Зачынены на падставе языковых уставаў 62 беларускія пачатковыя школы, а вучыцялёў цягнуць да адказнасьці за... навучаньне дзяцей у матчынай мове...

Беларускіх студэнтаў, скончыўшых беларускія гімназіі, ня прыймаюць у польскія ўнівэрсытэты, тады калі яны прыймаюцца ў унівэрсытэты ўсіх краёў.

Дзеля гэтага моладзь выяжджае ў Менск, у Кіеў, у Харкаў.

Ці гэтыя адносіны да славянскіх меншасьцяў **могуць** зьмяніцца? — пытаецца прамоўца і адказвае, што **павінны.**

Ужо на нашых вачох, — кажа, — зьмяніліся адносіны да жыдоў. Правадыр польскага шавінізму, антысэміт Станіслаў Грабскі, падпісаў згоду з жыдоўскім грамадзянствам, бо жыцьцё дужэй, чым тэарэтыка шавіністычнага нацыяналізму. — Трэба было грошаў, трэба было заграніцай проста глянуць у вочы, і таму антысэміт Ст. Грабскі дае правы школам жыдоўскім, пасылае прадстаўнікоў сваёго міністэрства на эгзаміны ў жыдоўскія вучыцельскія сэмінарыі—гавораць там прывітаньні...

Прамоўца верыць, што мусяць быць зьмененыя немагчымыя дагэтуль адносіны да беларусаў і ўкраінцаў, а калі польскі нацыяналізм сам не зразумее патрэбы гэнага, то настане такі мамэнт, што прадстаўнікі польскага фабрычнага промыслу прыйдуць і скажуць: „адчыні, пане міністар, беларускія і ўкраінскія школы, бо вось мусіма прадаваць свае тавары ў Савецкай Беларусі і Украіне, інакш — зачынім фабрыкі!!. І тады ўжо Грабскія ўступяць і **толькі тады** школы дадуць.

Ад Рэдакцыі. Падаем зьмест лекцыі грам. Голубкі, каб паказаць, што ў польскім грамадзянстве ўжо ёсьць адзінкі, якія ўмеюць распазнаць **прычыны хваробы**, на якую хварэе Польшча. На жаль, ні ў кога ў Польшчы ёшчэ няма **ахвоты волі** распачаць радыкальнае лячэньне; няма і ў партыі грам. Голубкі, якая разам з п. Ст. Грабскім праводзе асуджаную лектарам палітыку...

Аб чым пішуць.

Няўжо-ж запраўды аднадумцы?!

Вярнуўшыся з падарожы ў ССРР і ў Радавую Беларусь, пасол Ярэміч надрукаваў у сваім органе „Сялянская Ніва" стацьцю, у якой як быццам жыўцом сьпісывае з эндэцкіх газэт „верыгодныя" апісаньні „краіны дзікага тэрору" і т. п. Гледзячы вачыма польскае буржуазіі, пан Ярэміч таму **добраму**, што павінна-б было служыць прыкладам для Польшчы ў адносінах да беларусаў, **пасьвячае адно толькі—тры радкі!** Затое-ж не шкадуе месца на маляваньне работніцка-сялянскае рэспублікі самымі панурымі фарбамі.

Апісаньне Радавае Беларусі так спадабалася дэфэнзыўнаму „Беларускаму Слову", што правадыр гэтае газэты, „доктар" Павлюкевіч, перадрукаваўшы стацьцю пана Ярэміча, піша аб ёй дасл оўна гэтак:

> Мы з вялікай прыемнасьцю зьмяшчаем гэтую рэвалюцыйную характэрыстыку „Савецкай Беларусі" і падкрэсьліваем, што, ня гледзячы на частыя прынцыповыя разыходжаньні з п. Ярэмічам, яго характэрыстыка „Савецкай Беларусі" — зусім ідэнтычна з нашай, якую мы ўжо ня раз падавалі на шпальтах нашай газэты".

Але гэтым „захвыты" не канчаюцца: бо-ж на канцы нумару дэфэнзыўны орган „любоўна" жартуе з партыйнага таварыша пана Ярэміча, пасла Рагулі, і... абяцуе яму на новых выбарах пасольскі мандат!

Справа толькі ў тым, што мандаты дае.. народ!

ХРОНІКА.

Суд над грам. Канчэўскім і вучн. Салагубам. 9. III. 26 г. у апэляцыйным судзе разглядалася справа грам. Канчэўскага і вучня Салагуба, абвінавачваных у камунізьме.

На судзе старшынстваваў судзьдзя Бохвіц; з боку пракуратуры выступаў, як экспэрт, вядомы Снарскі—шэф варшаўскай дэфэнзывы; бараніў адв. Родзевіч.

Гр. Канчэўскаму суд кары не паменшыў, пакінуўшы прысуджаныя акружным судом 4 гады катаргі і не залічыўшы часу, што сядзеў да суда; вуч. Салагубу зьнялі 1 год, залічыўшы папярэдні вастрожны час—тры месяцы, так што засталося яму адсядзець яшчэ дзевяць месяцаў.

Лекцыя А. Трэпкі. У мінулую нядзелю, 7-га сакавіка, у салі Беларускае Гімназіі ў Вільні адбылася чародная лекцыя, уладжаная Беларускім Студэнцкім Саюзам. Чытаў ведамы беларускі культурны дзеяч, грам. Антон Трэпка, на тэму: „Машына ў жыцьці чалавека".

З веснавых настрояў.

Прачніся, дружа, ўстань бадзёрна!
Пакінь свой цяжкі сон і мары.
Зьвініць жаўронка сьпеў, уторна
Усходу, гімн той—вольны, жвавы.
Вясна-штукар ужо прышла
І волі сьцяг нам прынясла.

Гані ганебны сон—зьнявагу,
Даволі ў шапку спаць, нябога!
Зірні на ўсход!... Дадасьць адвагі
Жыцьця запал там маладога.
Бо жарты строіць з ім вясна....
Д'ямэнтам зіхаціць раса.

Вясной раса жыцьцё прыносе;
Расу п'юць кветкі на ўвасходзе.
Устаў касец. Каса сьвіргоча....
І спаць ён больш ужо ня хоча:
Чырвоны золак вабіць так.
Жыць вольным хоча нябарак.

Ігнат Балагур

У больш чым гадзіннай лекцыі грам. Трэпка высьвятліў тое вялізарнае значэньне машыны, якое выявілася перад усім у эканоміі працы. Машына—гэта тая магутная сіла, якая дапамагла працоўным агранічыць іх катаржную работу 8-мю гадзінамі, а з далейшым поступам тэхнікі можа давясьці лічбу неабходных гадзін працы да 6, 4, ці йшчэ менш. Машына — гэта сіла, якая нясе вызваленьне працоўным наагул.

Саля была поўная моладзі і прадстаўнікоў старэйшага грамадзянства; лектару дзякавалі гучнымі воплескамі.

Як папасьці ў ССРР? З прычыны частых зваротаў да нашае Рэдакцыі з пытаньнямі: як і хто можа ўехаць у ССРР? — падаем тут жменю інфармацыяў, пададзеных у № 37 „Сав. Белар." з 16 лютага с. г.

Асобы, якія жывуць за межамі СССР, але жадаюць прыехаць у Савецкі Саюз, павінны зьвярнуцца з адпаведным хадайніцтвам у бліжэйшае паўнаважнае прадстаўніцтва, або консульства СССР заграніцай.

Да гэтай просьбы прыкладаецца: абавязацельства сваякоў, што жывуць у межах СССР, аб тым, што яны згаджаюцца ўзяць на сваё ўтрыманьне асобу, якая жадае прыехаць сюды, а таксама, што яны самі забясьпечаны патрэбнымі сродкамі.

Такімі пасьведчаньнямі служаць: пасьведчаньні з месца работы, або службы, пасьведчаньні зямельных устаноў, што асоба мае зямельны надзел і прасіцель ёй патрэбен, як работнік, а таксама прадставіць спраўку аб плацяжы падаходна-маемаснага падатку.

Подпіс на абавязацельстве павінен быць заверан у гарадох натарыяльнымі канторамі, а ў сельскіх мясцовасьцях—сельсаветамі і райвыканкомамі.

Памянёныя пасьведчаньні могуць выдавацца толькі па хадайнічаньні асоб, якія жывуць у межах ССРР, і павінны перасылацца заграніцу праз Управу Упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежных Спраў СССР пры ўрадзе БССР, пры ўмове аплаты консульскага збору ў суме 4 руб. 40 кап. Гэтыя дакумэнты могуць здавацца ў сельсаветы і райвыканкомы для перасылкі іх у Управу Упаўнаважаных праз Сэкрэтарыяты Акруговых Камітэтаў.

Дастаўка вышэйпамянёных абавязацельстваў адносіцца выключна да асоб старых, недарослых, жанок, мужы якіх знаходзяцца ў СССР, і невялікая катэгорыя грамадзянак СССР, якія вышлі замуж за палонных іншых краін і паехалі з імі на радзіму, а ў сучасны момант па розных прычынах (сьмерць мужа, развод і г. д.), прымушаны шукаць прытулку ў сваіх сваякоў.

Афіцыяльны курс грошы на 15 сакавіка. Даляр — 7 зл. 80 гр. Залаты рубель — 3 зл. 99 грошы.

Карэспандэнцыі.

Самы сабе збудавалі школу.

(В. Капачы, Палачанскай гм., Валожынскага пав.).

Сяляне нашай вёскі пераканаліся, што бяз школы немагчыма, і рашылі самы збудаваць яе. Выбралі разумнага і энэргічнага падсолтыса Івана Вірынскага, які зарганізаваў працу пры будаваньні школы. Трэба сказаць, што і войт наш з пісарам Ванькоўскім памаглі нам у гэтым добрым пачынаньні: яны далі нам 500 злотых.

Такім чынам пры ахвоце і жаданьні **нашы сяляне самы збудавалі саба школу.** **С. К.**

Ад Рэдакцыі. Хай гэты добры прыклад пяроймуць і другія сяляне беларусы, бо трэба памятаць, што, калі што **мы здабудзем**, то толькі **дзякуючы сваім уласным высілкам і стараньням.**

Вясковы спэктакль.

(В. Канюхі, Ляхаўскае гм.).

Канюхі ня сьпяць...

У нядзелю 28-га лютага с. г. ізноў наладзілі спэктакль. На гэты раз публіка ўбачыла „Залёты" В. Дунін-Марцінкевіча. П'еса гэтая сама па сабе ўжо аджыла свой век; па зьместу яна ў цяперашні час не прадстаўляе ніякае вартасьці, а, уводзячы выразны падзел на „чорную і белую косьць", павінна адыйсьці ў архіў, бо трэба-ж дбаць, каб пастаўленая п'еса прыносіла глядзельнікам маральную карысьць. Апошнюю могуць даць творы Ф. Аляхновіча, Я. Купалы і др., якім і павінны назначаць першае месца нашы аматары.

„Залёты“ ў Канюхах выйшлі не самавіта. Артысты-аматары мелі многа заган: часта адварачваліся ад публікі, каб укрыць сьмех, крыху мыляліся, быў вялікі недахват у рухах, мала адчувалася жыцьця ў гутарцы, бо словы падалі так манатонна, як дзіцячая няўдалая дэклямацыя якога-колечы вершу. Да ўсяго гэтага ў будынку (спэктакль ладзіўся ў магазыне, дзе перад вайной ссыпалі збожжа) было вельмі сьцюдзёна, ад чаго вавет у часе гульні публіка, грэючыся, добра стукала нагамі.

Аднак, ня гледзячы на ўсе гэтыя мінусы, прадстаўленьне зрабіла добрае ўражаньне на прысутных,— усе былі здаволены, доказам чаго былі тыя гучныя воплескі, якімі закончылася прадстаўленьне.

Трэба сказаць, што наладжаньне спэктаклю ў такой глухой вёсцы, як Канюхі, дзе так цяжка знайсьці ахвотнікаў, дзе асабліва сярод дзяўчат пануе няграматнасьць, а ў лучнасьці з гэтым нічым ня вытлумачаны дурны сорам паказацца на сцэне, дзе так шмат навет сярод „сярмяжнікаў“ і то як старых, так і маладых, няпрыхільнікаў, якія, не перабіраючы ў спосабах, патрапяць байкатаваць усе добрыя пачынаньні інтэлігентных адзінак, — вымагае вялікае энэргіі, моцнае волі. Дзеля гэтага слава арганізатарам і аматарам-ахвотнікам! Вы ўсе, хто разумее важнасьць гэтае справы, не павінны апускаць рук, не павінны палохацца меншых і большых перашкодаў і таксама дурнога байкоту, а сьмела ісьці наперад! Хай другія вёскі бяруць прыклад з вас!..

Nemo.

З Радавае Беларусі.

Барацьба з няпісьменнасьцю.

Дзеля папулярызацыі ідэй тав-ва „Прэч няпісьменнасьць“ наладжана адпаведная кампанія з 25-га лютага да 10-га сакавіка.

Новы пэдагагічны тэхнікум.

Галоўпрафасьветы мае адчыніць у сёлетнім годзе беларускі пэдагагічны тэхнікум у Мазыры.

Новыя зборнікі.

У апошнія часы вышлі з друку наступня маладнякоўскія зборнікі:

Вішнеўская, Пфляўмбаум, Бандарына—**калектыўны зборнік вершаў.**

Бобрык, Звонак, Туміловіч—**„Пунсовае раньне“.**

„Слуцкія песьняры“ (Шукайла, Відук, Сукала, Атава і Іда Чырвань).

Пасяўная плошча БСРР.

Паводле вестак Наркамзему, пасяўная плошча сялянскіх гаспадарак БСРР за 1924 — 25 г. узрасла з 2.287.277 дзес. да 2.492.965 дзес. (на 9 прац.).

Загатоўка лесу для сялян.

Каб рэгулярна дастаўляць дрэва ў адчыненыя ў малалясных акругах лясныя склады, у сёлетнім апэрацыйным годзе НК Земляробства мае загатовіць для іх 15.015 кубічных сажняў дроў і 2.255 куб. саж. лесаматар'ялаў.

Для апэрацый лясных складаў ім патрэбен банкаўскі крэдыт на люты, сакавік і красавік у суме 86.939 руб.

Адбудова.

1.500.000 руб., якія асыгнованы Маскоўскім Камунальным Банкам на кватэрнае будаўніцтва БСРР, прэзыдыум Дзярж. Плян. Камісіі разьмеркаваў гэтак:—Менскай акрузе—520.000 р., Віцебскай—300.000 р., Бабруйскай—175.000 р., Магілеўскай—100.000 р., Барысаўскай—90.000 р., Аршанскай—80.000 р., Полацкай—100.000 р., Слуцкай — 60.000 р., Мазырскай — 40.000 р. і Калінінскай — 35.000 р.

Гэтыя сродкі павінны быць скарыстаны выключна на пашырэньне жылой плошчы.

У бягучым будаўнічым сэзоне Менскі аддзел камунальнай гаспадаркі мае адрамантаваць 20 каменных дамоў. На гэта будзе адпушчана 70.000 р.

Працоўныя калектывы БСРР.

За апошні год працоўныя калектывы БСРР вырасьлі з 2500 да 6000 рабочых, пераважна за рахунак вытворчых.

Апроч таго, працоўныя калектывы перадалі ў дзяржаўную базу прамысловасьці звыш 500 рабочых.

Што датычыцца вытворчых вынікаў, то за апошняе паўгодзьдзе працоўныя калектывы выпусьцілі тавараў на суму 2.900.000 р. Агульны зварот па вытворчых, працоўных і гандлёвых калектывах за паўгодзьзе даў 1.836.000 р.

У ўсебеларускім пажарным т-ве.

За год працы ўсебеларускае пажарнае т-ва дабілася значных посьпехаў у справе арганізацыі пажарных дружын на мясцох, а таксама правяло аб'яднаньне пажарных працоўнікоў БСРР у свой саюз.

Да сучаснага маманту да саюзу ва ўсіх акругах далучылася 200 арганізацый, у якіх налічваецца 9000 сябр.

Прырост насельніцтва ў Менску.

Менскі ЗАГС у працягу студзеня зарэгістраваў па г. Менску 376 нарадзін і 150 сьмерцяў.

Такім чынам, за студзень насельніцтва ў Менску павялічылася на 226 чалавек, у тым ліку жанчын—104, мужчын—122.

Новы тарыф аплаты пісем.

З лютага на пошце ўведзены новы тарыф аплаты пісем, а іменна: звычайнае пісьмо—8 кап., заказное—18 кап., звычайнае пісьмо за межы — 14 кап., заказное—28 кап.

Беларусы у Латвіі.

Як у вас, так і ў нас.

Чытаючы № 4 (17) газэты „Беларуская Ніва“, мяне прывабілі дзьве стацьці: гэта „Што казаў сьляпы дзед“ і „Гутарка сялян“. Магу шчыра сказаць, што гэтыя гутаркі беларускіх сялян з - пад Польшчы вельмі падобны на гутаркі нашых сялян і працоўных места з-пад латышскае акупацыі.

Якраз і ў нас, хто чытае вашу газэту і газэту „Сялянская Ніва“, то першым чынам страшэнна шкадуюць, што некаторыя нашыя паслы разбіваюць на дзьве варожыя групы нашае сялянства і работнікаў, бо гэта вельмі шкодзе агульнай беларускай справе — справе вызваленьня нашага сяляніна з няволі ў абшарніка, як польскага, так і латышскага, а таксама вызваленьня працоўных места з-пад ярма буржуазіі.

Як відаць з газэты „Сялянская Ніва“, паслы сялянскага хаўрусу жадаюць дружбы з літвінамі і латышамі, інакш кажучы—з латышскай і літоўскай буржуазіяй,—з тымі, якія ўціскаюць нашую беларускую меншасьць, з якіх цяпер сялянскі саюз злажыў урад, латышчаць нашае беларускае насяленьне, зачыняючы беларускія школы і адчыняючы латышскія, робяць штучныя працэсы, дзеля таго, каб як-небудзь аслабіць і зьніштожыць наш рух.

Дзеля таго, што наша маса па свайму сацыяльнаму палажэньню і ў нас і ў вас аднолькава—бадай выключна бедната, — нам ня прыходзіцца рупіцца толькі аб сялянстве, а ня трэба забываць і працоўных места: гэтыя мазолістыя рукі, якія складаюць 25 працантаў нашага жыхарства. Бо толькі работнік і селянін у барацьбе за Сялянска-Работніцкі Саюз даб'ецца свайго сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

А таму прадстаўнікі Рабоча - Сялянскай Грамады зьяўляюцца шчырымі барацьбітамі за вызваленьне нашых паняволеных бедных мас і лепшую будучыню нашае Бацькаўшчыны. А газэта „Беларуская Ніва“ задаваляе нашу працоўную гушчу, так як і беларускія масы сялян і работнікаў пад Польшчай.

Дземенскі.

Юрыдычныя парады.

Гінаку.

Калі маніцёся будаваць склеп на старым мейсцы, то забараніць ніхто ня можа.

Падпішчыку 156.

Калі старшы брат даверанасьці ад таго, што ў Расеі, ня маець, то адабраць палавіну яго долі ня можна, хіба толькі зложыць мэтрыку сьмерці малодшага, калі той памёр.

Грам. Т. П.

Права сваё ўжо страцілі.

Кавалеўскаму.

За трыманьне аружжа без дазволу накладаецца кара ў адміністрацыйным парадку, а аружжа могуць сканфіскаваць.

Казімірук у.

Страты можна спаганяць судом ад таго, хто павінен трымаць мост у парадку; калі гэта належыць да абавязкаў Павятовага Сойміку, то ад Сойміка.

Падпішчыку 2406.

Не.

Усячына.

Горад „Залатой арды“.

У гор. Наровчатэ на Волзе, у часе раскопак, знайшлі татарскі горад, часоў канца XIII стагодзьдзя, эпохі Залатой арды. Пры раскопках знойдзена многа цікавага глінянага начыньня і розных манэт. Каля гораду былі вялізныя могілкі і мячэць.

Паштовая скрынка.

Атрымана:

Ад: — Сяргея Бурлыкі, Пятра Мароза, Мікалая Дзейкі, Зьмітра Гісіча, Е. Юрчука, Аўгена Мамчыца, Міхала Сурмача, Мікаля Казлоўскага, Мацея Шапавала, Рамана Дараховіча, Нікіпара Бакі, Тамаша Мышкі, Сьцяпана Сокала, П. Даманскай, Базыля Шпака, Аляксандра Жылінскага, Якуба Тамільчыка, Рыгора Саваша, Сяргея Багданчука, Яна Мукасея, В. Уладзімірава, Антона Яцкевіча, Язэпа Крэнца, Язэпа Лісэты, Язэпа Грыгарчука, Станіслава Бартасэвіча, Якіма Стэцкага, Касьцялкоўскага, Глафіры Пілецкай, Аўг. Міткевіча, Аляксандра Вашкевіча, Яна Венскага, Цупрыяна Макуцэвіча, Сьцяпана Цюнчыка, Яна Ласёнка, Мікалая Жыня, Хвёдара Абрамчука, Пятра Прадухі, Адама Кулакоўскага, Тамаша Чычкі, Бэнэдыкта Мышкевіча — **па 2 злотых.**

Ад:—Філарэта Клаўсуця, Мацея Семашкевіча, Яна Попкі, Сьцяпана Пагуды, Аляксандра Дараховіча, Мікалая Адамовіча—**па 3 злотых.**

Абвестка.

У дваццатых чыслах месяца лютага ад Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады ўсім Сябром Таварыства Беларускай Школы былі разасланы паведамленьні аб узносе належных складак, пры гэтым у кожным паведамленьні было сказана з каго колькі належыць.

Ц. Б. Ш. Р. гэтым яшчэ раз просіць Паважаных Сяброў аб урэгуляваньні сяброўскіх складак у тэрміне да „15“ красавіка г. году.

Сябры, няўнесшыя ў вышэй адзначаны тэрмін складак, на паставе § 12 статуту будуць лічыцца выбыўшымі з Таварыства.

15. II. 1926.

Цэнтр. Бел. Школьная Рада.

Рэдактар-Выдавец: Ян Марцінеўскі.
Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.